будучай рабоце не аднойчы стане сцэнарыстам праграмы ці якога-небудзь віду дзейнасці. Па-другое, не выключана, што кожны студэнт у той ці іншы перыяд сваёй дзейнасці абавязкова будзе вядучым разнастайных культурных праграм. Па-трэцяе, працэс стварэння сцэнарыя неаддзельны ад працэсу ўвасаблення.

Развіццё творчых здольнасцей у студэнта дадзенай спецыялізацыі павінна перш за ўсё прадугледжваць гэтыя аспекты яго будучай дзейнасці. Ажыццявіць пазначанае магчыма рознымі шляхамі, цесна ўзаемазвязанымі. Найбольш дзейсным сродкам з'яўляецца выкарыстанне паміж сабой актыўных метадаў навучання, сярод якіх вядучае месца належыць дзелавым гульням, г.зн. сцэнарнаму трэнінгу.

Сцэнарны трэнінг прадугледжвае прайграванне вызначаных заданняў, практыкаванняў, якія фарміруюць сцэнарныя навыкі і ўменні, дапамагаюць выкананню канкрэтнага сцэнарнага задання (пошукі сюжэта сцэнарыя, задумы, вобразнага яе рашэння і г.д.).

Трэнінг па сцэнарным майстэрстве дае магчымасць карыстацца рознымі методыкамі, якія дапускаюць дзейнасныя калектыўныя зносіны і ўключаюць наступныя асноўныя практыкаванні: сюжэтная і сітуацыйна-ролевая гульні ("сцэнарны эцюд"); прайграванне зададзенай сюжэтнай структуры; "калектыўныя імправізацыі"; "пошук задумы" - метад групавога пошуку сцэнарнай задумы, яе вобразнага рашэння і інш.

Развіццё творчых здольнасцей па авалоданні сцэнарным майстэрствам - працэс не вузкаспецыяльны, зведзены да ўзроўню навучання "тэхналогіі". Гэты працэс мае на мэце фарміраванне спецыяліста, які творча мысліць.

Бялоў У.І.,
канд.пед.навук,
дацэнт

## НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ САЦЫЯЛЬНАГА ПЕДАГОГА

1. Адной з важнейшых функцый прафесійнай дзейнасці сацыяльнага педагога сферы арганізацыі вольнага часу дзяцей і падлеткаў з'яўляецца забеспячэнне яго педагагічнай накіраванасці, г.зн. усебаковае выкарыстанне выхаваўчага патэнцыялу шляхам уключэння дзіцячага кантынгента ў працэс самадзейнай творчасці і рацыянальна арганізаванага адпачынку.

У сувязі з гэтым сацыяльны педагог павінен умець:

- арганізоўваць і ажыццяўляць культурную дзейнасць дзяцей і падлеткаў у вольны час у канкрэтным рэгіёне;
- забяспечваць высокі ідэйна-мастацкі ўзровень культурных праграм па арганізацыі вольнага часу;
- аказваць метадычную і практычную дапамогу дзіцячым грамадскім арганізацыям, школьным установам у рацыянальнай арганізацыі адпачынку дзяцей і падлеткаў;
- прагназіраваць і планаваць творчую і метадычную работу;
- вывучаць і абагульняць перадавы вопыт па арганізацыі вольнага часу дзяцей і падлеткаў.

2. Для забеспячэння студэнтаў спецыяльнасці "сацыяльны педагог" прафесійнымі ведамі ў гэтым напрамку адначасова з цыклам сацыяльна-педагагічных дысцыплін вывучаецца курс "Тэхналогія арганізацыі культурнай дзейнасці ў вольны час", распрацаваны выкладчыкамі кафедры педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці Беларускага універсітэта культуры.

Мэта курса – сфарміраваць у студэнтаў сукупнасць прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў для авалодання майстэрствам арганізацыі культурнай дзейнасці ў вольны час з дзецьмі і падлеткамі.

3. Курс уключае адносна самастойныя і разам з тым арганічна звязаныя паміж сабой раздзелы:

1. Выканальніцкае майстэрства:
а) мастацтва слова;
б) беларускі танцавальны фальклор;
в) выканальніцкі трэнінг;
г) беларускі музычны фальклор.
2. Асновы сцэнарнага майстэрства і рэжысуры.
3. Мастацка-музычнае афармленне праграм.
4. Арганізацыя гульнявой дзейнасці.
5. Арганізацыя пазнавальнай дзейнасці.
6. Арганізацыя творчай дзейнасці.

Вывучэнне курса дае магчымасць студэнтам засвоіць тэарэтычныя асновы сцэнарнага май-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

стэрства і рэжысуры культурных праграм, прынцыпы арганізацыі і метады ажыццяўлення гульнявой, конкурсна-забаўляльнай, пазнавальнай дзейнасці. У працэсе практычных і індывідуальных заняткаў студэнты авалодваюць навыкамі адбору зместу культурных праграм, засвойваюць асновы мастацтва слова, песні, танца, вывучаюць методыку арганізацыі разнастайных культурных праграм для дзяцей і падлеткаў ва ўмовах соцыуму.

4. Асаблівасці методыкі выкладання заключаюцца ў тым, што вывучэнне раздзелаў ажыццяўляецца паэтапна. Гэта абумоўлена адзінай мэтавай устаноўкай, прычым кожны этап павінен дапамагаць фарміраванню вызначаных прафесійных рысаў сацыяльнага педагога:

- індывідуальнага майстэрства валодання жывым словам, пластыкай цела, элементамі акцёрскага мастацтва (раздзелы, прысвечаныя культуры мовы, танцу, выканальніцкаму трэнінгу);
- уменняў і навыкаў эфектыўнага вырашэння задач арганізацыі культурнай дзейнасці ў вольны час ва ўмовах соцыуму (раздзелы, прысвечаныя асновам сцэ-нарнага майстэрства і рэжысуры, арганізацыі гульнявой, конкурсна-забаўляльнай, пазнавальнай дзейнасці).

5. Веды, уменні і навыкі, якія засвоены студэнтамі ў працэсе вывучэння раздзелаў курса, павінны ў інтэрпрэтаванай форме праявіцца як якасці асобы сацыяльнага педагога пры вывучэнні "Практыкума па драматургіі і рэжысуры культурных праграм па арганізацыі вольнага часу". На занятках па ім трэба прадэманстраваць:

- веданне асноў сцэнарнага майстэрства і рэжысуры;
- валоданне прыёмамі і метадамі пастановачнай работы;
- навыкамі эфектыўнай арганізацыі вольнага часу і падрыхтоўкі культурных праграм для яго правядзення;
- уменне спалучаць у сабе якасці педагога, выхавацеля дзяцей і падлеткаў і арганізатара іх культурнай дзейнасці ў вольны час.

6. Істотнай асаблівасцю курса з'яўляецца тое, што ён арганічна звязаны з цыклам сацыяльна-педагагічных дысцыплін, якія дазваляюць студэнтам у рэальнай грамадскай практыцы праяўляць педагагічнае майстэрства і прафесійныя арганізатарскія здольнасці.

Гуд Н.І.
ст.выкладчык

## АСАБЛІВАСЦІ ВЫКЛАДАННЯ ПРАДМЕТА "КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВЫЯ СВЯТЫ" Ў НАВУЧАННІ САЦЫЯЛЬНЫХ ПЕДАГОГАЎ

Сучасныя тэндэнцыі развіцця тэорыі і практыкі выхавання адлюстроўваюць хуткае ўзрастанне ролі сацыяльнай педагогікі, пошук шляхоў абнаўлення сістэмы выхавання дзяцей і моладзі.

Найбольш рэальнае і перспектыўнае выйсце з крызіснай сітуацыі бачыцца ў актывізацыі ўзаемасувязей сацыяльнага педагога з сям'ёй.

У распрацоўцы зместу, адбору формаў і метадаў дапамогі сям'і ў выхаванні дзяцей і моладзі ў сучасных варунках студэнтам дапаможа курс "Каляндарна-абрадавыя святы", у які ўваходзіць раздзел "Беларуская абрадавая кухня".

Ва ўсе часы галоўную ролю ў выхаванні дзяцей адыгрывала сям'я, дзе дзіця пазнавала навакольны свет, фарміравалася як асоба. Якім чалавекам яно вырасце, у першую чаргу залежыла ад бацькоў, ад таго, як складаліся сямейныя адносіны. У кожнай сям'і былі свае прынцыпы выхавання, у аснове якога ляжала перадача духоўнай і працоўнай спадчыны, таму дзеці з маленства прывучаліся да працы. Дзяўчынкі з 7-8 гадоў пачыналі вучыцца прасці кудзелю, гатаваць ежу. Спачатку яны дапамагалі маці, а з 12-13 гадоў умелі ўжо прыгатаваць такія стравы, як вараная бульба, булён і іншыя.

Вялікае месца ў жыцці сям'і займалі традыцыйныя каляндарныя святы і абрады. Выкананне прадугледжаных традыцыяй абрадавых дзеянняў аб'ядноўвала і збліжала ўсіх членаў сям'і. Нормы і правілы паводзін, парадак выканання абрадаў перадаваліся ад старэйшых да малодшых. Таму шмат увагі ўдзялялася навучанню прыгатавання абрадавых страў, такіх як бабіна каша, студзіна, верашчака, куцця. Асаблівая пашана заўсёды ўдзялялася хлебу, з дзяцінства выхоўваліся пачуцці павагі, беражлівых адносін да хлеба. З ім ішлі на радзіны, у сваты, на вяселле. Таму шмат увагі ўдзялялася навучанню выпякаць хлеб. Кожная маці старалася навучыць сваю дачку добра выпякаць хлеб, гатаваць абрадавыя і традыцыйныя беларускія стравы, ведаць этыкет паводзін за сталом.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ